УДК 808.26
**МЯТЛІЦКАЯ Д.А.**, студэнт
Навуковы кіраўнік **КУРДЗЕКА Ж.П.**, ст. выкладчык
УА «Віцебская ордэна «Знак Пашаны» дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны», г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь

# АСАБЛІВАСЦІ НЕКАТОРЫХ ІХТЫЯЛАГІЧНЫХ НАЙМЕННЯЎ

Значную частку тэрыторыі нашай краіны складае яе «блакітная цаліна», шчыльна населеная рознымі відамі рыб і іншых жывых арганізмаў. Іхтыялогія – раздзел заалогіі, прысвечаны ўсебаковаму вывучэнню рыб. Іхтыя – першая частка складаных слоў, якая мае адносіны да рыб (іхтыёлаг, іхтыяфаўна, іхтыязаўр, іхтыятаксікоз). Мэтай нашай працы з’яўляецца лексіка-семантычны, параўнальны і словаўтваральны аналіз беларускай і рускай іхтыялагічнай лексікі, вызначэнне яе месца ў лексічным фондзе беларускай мовы. Асноўнай задачай даследавання з’явілася аналізаванне названай лексікі ў словаўтваральным, а таксама ў лексіка-семантычным аспекце. У працы прааналізавана больш за 50 найменняў рыб, якія сустракаюцца на тэрыторыі Беларусі.

Сярод іхтыялагічнай лексікі мы вылучылі тры структурныя тыпы. Большую частку дадзенай лексікі складаюць бінарныя назвы рыб: мінога рачная, асётр рускі, стронга ручаёвая, рапушка еўрапейская, вугор еўрапейскі, сомік карлікавы і інш. Наступную частку складаюць аднаслоўныя найменні рыб, тыпу: быстранка, вусач, лешч, зубатка, пячкур, гарбуша і інш. Таксама значная частка іхтыёнімаў – гэта складаныя адзінкі: чырванапёрка, белавочка, таўсталобік, вуалехвост, тэлескоп, верхаводка, молат-рыба, сом-кошка, бычок-пясчанік, джгір-насар, шыракалобка і інш.

Сярод іхтыялагічнай лексікі сустракаюцца аднолькавыя найменні ў дзвюх мовах: лешч – лещ, лінь – линь, вугор – угорь, судак – судак, карась – карась, жэрах – жерех і інш. Часта сустракаюцца іхтыёнімы, якія не супадаюць у беларускай і рускай мовах: верхаводка – уклея, чарнапуз – подуст, пячкур – пескарь, таймень – кумжа, рыбец – сырть, джгір – ёрш і інш. Паводле колеру можна вылучыць наступныя назовы рыб: чырванапёрка, ласось стальнагаловы, белавочка, амур белы і чорны, таўсталобік пярэсты, карась залаты, сінец і інш. Паводле будовы цела рыбы: таўсталобік, зубатка, колюшка, вуалехвост, тэлескоп, камета, шыракалобка і інш. Паводле суаднесенасці з пэўным прадметам: падкаменшчык, пячкур, гарбуша, пясчанік, аўсянка, гарчак і інш. Але сярод іхтыёнімаў вылучаюцца і найменні нявызначанай матывацыі: мінога ручаёвая, кумжа, мянтуз, сіг, навага.

Праца мае пэўную практычную значымасць, таму што дадзеныя іхтыялагічныя найменні можна выкарыстоўваць на практычных занятках па дысцыпліне «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» пры вывучэнні такіх тэм, як «Навуковы стыль», «Лексічны склад беларускай мовы», а таксама пры вывучэнні дысцыплін «Заалогія» і «Іхтыяпаталогія».

РЕПОЗИТОРИЙ УО ВГАВМ